Спорт-тайм

# ЦІ БУДУЦЬ ЛЕТАМ ГУЛЬНІ?

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра найбольш актуальныя навіны ў сусветным і беларускім спорце.**

**1.** ***Адтэрміноўка правядзення летніх Алімпійскіх гульняў у Токіа не выключана.*** Такі варыянт магчымы, калі нельга будзе правесці спаборніцтвы ў звычайным фармаце. Пра гэта, выступаючы ў парламенце, заявіў прэм'ер–міністр Японіі Сіндзо Абэ. «Пазіцыя Міжнароднага алімпійскага камітэта адпавядае курсу на правядзенне Алімпіяды ў поўным фармаце. Калі ажыццявіць гэта стане немагчыма, то трэба будзе прыняць рашэнне аб адтэрміноўцы, зыходзячы з таго, што мы ў першую чаргу павінны думаць аб спартсменах, — сказаў



Сіндзо Абэ. Ён таксама падкрэсліў, што рашэнне з нагоды правядзення Алімпіяды прымае МАК, і на дадзеным этапе пытанне аб адмене Гульняў не стаіць.

Тым часам алімпійскі камітэт Канады выступіў з заявай, што не будзе адпраўляць спартсменаў на летнюю Алімпіяду 2020 года, калі Гульні не перанясуць на год з-за каранавіруса. «Канадскія камітэты прынялі рашэнне не адпраўляць каманды на Алімпійскія і Паралімпійскія гульні летам 2020 года і настойліва заклікаюць Міжнародны алімпійскі камітэт, Міжнародны паралімпійскі камітэт і Сусветную арганізацыю аховы здароўя перанесці гульні на адзін год. Мы перажываем разгар глабальнага крызісу ў галіне аховы здароўя, які значна важнейшы за спорт», — адзначаюць канадцы.

З аналагічнай заявай выступіў НАК Аўстраліі, які адзначыў, што ва ўмовах пандэміі каранавіруса сабраць каманду да Алімпіяды–2020 немагчыма, і яны будуць рыхтавацца да правядзення галоўных стартаў у наступным годзе.

**2.** ***Чэмпіянат свету па хакеі 2020 года адменены, паведаміла Міжнародная федэрацыя хакея (IIHF).*** Рашэнне было прынята ў сувязі з пандэміяй каранавіруса COVID—19. Улічваючы бягучыя абставіны і наступныя, абмеркаваныя з рознымі зацікаўленымі бакамі, Савет IIHF вырашыў, што чэмпіянат свету ў Цюрыху і Лазане не можа адбыцца. «Гэта жорсткая рэальнасць для кожнага міжнароднай хакейнай сям'і, але мы павінны з ёй змірыцца. Каранавірус — гэта глабальная праблема, якая патрабуе значных намаганняў з боку дзяржаўных органаў для барацьбы з яго распаўсюджваннем. Мы павінны зрабіць усё магчымае, каб падтрымаць гэтую барацьбу. Мы павінны пакуль адкласці спорт і падтрымаць як дзяржорганы, так і хакейную сям'ю», — сказаў прэзідэнт IIHF Рэнэ Фазель.

У паведамленні Міжнароднай федэрацыі хакея адзначаецца, што няма магчымасці перанесці турнір гэтага года ў іншую краіну. Рэнэ Фазель таксама расказаў, што чэмпіянат свету ў Мінску і Рызе, які павінен адбыцца ў 2021 годзе, можа быць перанесены на 2022 год.

**3.** ***Стартаваў 30–ы чэмпіянат Беларусі сярод каманд вышэйшай лігі па футболе.*** Чэмпіёны



краіны футбалісты брэсцкага «Дынама» ў сябе дома згулялі ўнічыю са «Смалявічамі», якія вярнуліся ў вышэйшую лігу, — 1:1, уладальнік «серабра» барысаўскі БАТЭ прайграў на выездзе мінскаму «Энергетыку—БДУ» — 1:3, а бронзавы прызёр салігорскі «Шахцёр» у сябе дома саступіў жодзінскаму «Тарпеда—БелАЗ» з вынікам 0:1. З такім жа лікам мінскае «Дынама», якое заняло ў мінулым годзе 4-е месца, прайграла на сваёй арэне дэбютанту вышэйшай лігі брэсцкаму «Руху». Бабруйская «Белшына» не ўтрымала перамогу над футбалістамі «Мінска», саступіўшы з лікам 1:3. З першай пяцёркі чэмпіянату краіны 2019 года перамаглі толькі футбалісты «Іслачы», якія перайгралі на полі ФК «Мінск» гасцей з гродзенскага «Нёмана» з мінімальнай перавагай — 1:0. З такім жа вынікам «Віцебск» у сябе дома ўзяў верх над «Гарадзеяй». Футбалісты «Слуцка» з лікам 3:1 перайгралі на сваім полі мазырскую «Славію».

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.01 | 19.31 | 12.30 |
| Віцебск — | 6.50 | 19.22 | 12.32 |
| Магілёў — | 6.51 | 19.21 | 12.30 |
| Гомель — | 6.49 | 19.17 | 12.28 |
| Гродна — | 7.17 | 19.46 | 12.29 |
| Брэст — | 7.18 | 19.46 | 12.28 |

### Месяц

*Маладзік у 12.28.*
*Месяц у сузор'і Авена.*

### Імяніны

***Пр.*** *Сафрона, Яфіма.*
***К.*** *Катарыны, Габрыеля, Марка, Шымана.*



Фота Максіма ШАСТАКОВА.

## ЗАЎТРА




### ...у суседзяў

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА +5..+7°С | КІЕЎ +5..+7°С | РЫГА +7..+9°С |
| ВІЛЬНЮС +5..+7°С | МАСКВА +6..+8°С | С.-ПЕЦЯРБУРГ +7..+9°С |

## Даты Падзеі Людзі

**24 САКАВІКА**




**1707** год — нарадзіўся (Градзеншчына) Ігнацій Кульчынскі, гісторык, царкоўны дзеяч. У 1727–1735 гадах знаходзіўся ў Рыме, дзе атрымаў званне доктара багаслоўя, займаўся гісторыяй царквы, шмат пісаў і выдаваў багаслоўскія працы. У 1735-м вярнуўся на радзіму, дзе стаў архімандрытам гродзенскага Каложскага манастыра. Даследаваў гісторыю Гродна, вёскі Жыровіцы на Слонімшчыне, склаў інвентар Каложскай царквы. Вывучаў таксама гродзенскі Стары замак. У сваіх працах апісаў Крыж Ефрасінні Полацкай, дзякуючы чаму рэліквія стала вядомая на Захадзе.

**1889** год — нарадзіўся Аляксандр Восіпавіч Сташэўскі (Сташэўскі-Стасевіч), дзяржаўны дзеяч Беларусі. У 1911 годзе скончыў Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю, у 1920-м — Мінскі педагагічны інстытут. У Першую сусветную вайну быў на Паўднёва-Заходнім фронце. Адзін з ініцыятараў стварэння ў студзені 1920-га Беларускай камуністычнай арганізацыі (БКА), член яе ЦК, адзін з арганізатараў антыпольскага падпольнага і партызанскага руху на Міншчыне. З ліпеня 1926 года — наркам унутраных спраў БССР, з верасня 1928-га — наркам юстыцыі і пракурор БССР. У 1937 годзе рэпрэсіраваны, у 1938-м расстраляны. Рэабілітаваны ў 1957 годзе.



**1905** год — нарадзіўся Іван Андрэевіч Флёраў, удзельнік баёў супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У 1941 годзе капітан Флёраў камандаваў Асобнай эксперыментальнай батарэяй рэактыўных установак («кацюш»), якая зрабіла першы залп па нямецка-фашысцкіх захопніках на чыгуначнай станцыі Орша, паклаўшы пачатак баявога прымянення якасна новага віду артылерыі. Загінуў у баі ў 1941-м.

**1940** год — на тэрыторыі Заходняй Беларусі праведзены выбары дэпутатаў у Вярхоўны Савет СССР і Вярхоўны Савет БССР.




**1721** год — нямецкі кампазітар Іаган Себасцьян Бах адправіў у падарунак маркграфу Крысціяну Людвігу Брандэнбург-Швецкаму партытуру сваіх твораў, цяпер вядомых як «Брандэнбургскія канцэрты».

**1882** год — у Берліне нямецкі вучоны Роберт Кох абвясціў пра адкрыццё ўзбуджальніка сухот. Праз год ён выявіў і ўзбуджальніка халеры. У 1905-м навукоўцу была прысуджана Нобелеўская прэмія па фізіялогіі і медыцыне.



**1900** год — нарадзіўся Іван Сямёнавіч Казлоўскі, расійскі і ўкраінскі спявак, народны артыст СССР (1940), Герой Сацыялістычнай Працы. У 1926–1954 гадах — саліст Вялікага тэатра ў Маскве. Лаўрэат Сталінскай прэміі (1941, 1949).

**1950** год — нарадзіўся Аляксандр Мікалаевіч Буйноў, расійскі спявак, музыкант, кампазітар, шоўмен, народны артыст Расійскай Федэрацыі (2010), народны артыст Інгушэціі (2004), народны артыст рэспублікі Паўночная Асеція — Аланія.

## УСМІХНЕМСЯ

**Любы посуд можа быць аднаразовым, калі ты дастаткова багаты.**

Вырашыў пачаць працаваць аддалена. Толькі ніяк не зразумею: калі ніхто не ведае, што я працую, да каго па заробак звяртацца?

**Геніяльная шыльда ў адной кавярні:**

**«У нас няма Wi-Fi не таму, што мы жмоты. Проста размаўляйце з тымі, з кім прыйшлі».**

Зубы-імплантаты — гэта, па сутнасці, помнікі для зубоў, што зарана сышлі.

**Цяжэй за ўсё паставіць сябе на чужое месца, калі яно — хлебнае.**





ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс);
аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі — 287 18 81.

прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы несуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 952.

Нумар падпісаны ў 19.30 23 сакавіка 2020 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12